# Весці

## Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка

**№ 2 (32) 2002**

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

## Змест

***Галоўны рэдактар:***
Л. Н. Ціханаў

***Рэдакцыйная калегія:***
Н. Г. Алоўнікава
Г. А. Баўтута
В. А. Бондар (*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў (*нам. галоўнага рэдактара*)
А. М. Вітчанка
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
Т. А. Грыгор'ева
Я. Л. Каламінскі
Л. А. Кандыбовіч
Н. І. Копысава (*адказны сакратар*)
Г. А. Космач
І. А. Новік
А. У. Рагуля
М. Т. Стэльмашук
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
І. І. Цыркун
Л. Б. Шнеперман
У. А. Якавенка
М. С. Яўневіч

***Адрас рэдакцыі:***
220007, Мінск,
вул. Магілёўская, 37,
пакой 124,
тэл. 219-78-12

***Педагогіка***

*Талкачова А. У.* Педагагічныя ўмовы павышэння эфектыўнасці грамадзянскага выхавання малодшых школьнікаў ..........3
*Замыслава Т. А., Паляшчук М. М.* Некаторыя падыходы да праектавання і рэалізацыя мадэлі маніторынга якасці падрыхтоўкі спецыялістаў у педагагічным каледжы..........9
*Ляховіч А. В.* Фарміраванне пазнавальнай актыўнасці студэнтаў пры рашэнні матэматычных задач ..........18
*Шэндэровіч-Анціпава Л. М.* Аб удасканаленні структуры і зместу вучэбных праграм па матэматыцы і спецтэхналогіі прафтэхвучылішч будаўнічага профілю ..........22
*Ніжнікава А. Б.* Сістэмны падыход да фарміравання пеўчай культуры настаўніка музыкі..........25
*Акуліч Ю. У.* Індывідуальныя адукацыйныя патрэбы студэнтаў факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры ..........32

***Псіхалогія***

*Крайчанка М. У.* Настойлівасць дзяцей малодшага школьнага ўзросту і яе сувязь са статусным становішчам ..........36
*Азаренок Н. В.* Взаимосвязь восприятия рекламы и социальных установок..........42

***Дэфекталогія***

*Фяклістава С. М.* Асаблівасці гульнявой дзейнасці дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту з парушэннямі слыху..........47
*Гируцкий И. А.* Виды словесного ассоциативного эксперимента и специфика его проведения у детей с первичной интеллектуальной недостаточностью..........54

***Мовазнаўства***

*Буркова О. М.* Эпитеты в поэзии Сергея Есенина и их перевод на белорусский язык..........62
*Курилова Л. Н.* Особенности стихотворного ударения..........68
*Анищик И. И.* Фоника рифмы в русской стихотворной речи XIX века (на материале стихотворения Д. В. Веневитинова «Кинжал»)..........74
*Іваноў Я. Я.* «Парадоксы» і «кааны» як семантычныя тыпы афарыстычных выказванняў..........82

***Літаратуразнаўства***

*Зылевич Д. П.* Категория пространства в лирике М. Ю. Лермонтова ..........89
*Ракова О. П.* Проблемно-тематическая общность пьес М. А. Булгакова «Бег» и Янки Купалы «Тутэйшыя»..........94

АРК

46. *Лаппо И. И.* Разбор исследования М. К. Любавского «Лито
русский сейм» (Отчет о девятом присуждении премий Г. Ф. Кар
Императорским Обществом истории и древностей российских
Московском университете) // Чтения в Императорском Обществе
тории и древностей российских при Московском университете.
1903. Кн. 3. С. 1—78.
47. *Середонин С. М.* Рец. на исследование И. И. Лаппо «Великое
жество Литовское от заключения Люблинской унии до смерти С
фана Батория (1569–1586 гг.)» (Отчет о восьмом присуждении п
мии Г. Ф. Карпова Императорским Обществом истории и древно
Российских при Московском университете) // Чтения в Им
торском обществе истории и древностей российских при Моско
университете. М., 1905. Кн. 1 (212) Отд. 5. Смесь. № 9. С. 4—29.
48. *Вяроўкін-Шэлюта Ул.* Маршалак // Энцыклапедыя гісторыі Бела
У 6 т. / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал. Г. П. Пашкоў і інш. Мн., 19
Т. 5. С. 83.
49. *Korczak L.* Marszałkowie ziemscy w WKL w XV wieku // Cracovia, Po
Europa. Studia z dziejów średniowiecza ofiarowane J. Wyrozumskiemu w
ćdziesiątą rocznicę urodzin i czterdziestolecia pacy naruкowej / Red.
W. Bukowski, K. Ożóg, F. Sikora, S. Szczur. Kraków, 1995. S. 373—376.

*SUMMARY*

*The article deals with the problem of the procedure of the sessions
the «little diets» (local diets) of nobles (sojmiks) in the Grand Duchy
Lithuania in the second half of 16th — early 17th centuries. The author
mes to the conclusion that, in the period of the 1580s — 1620s, marsh
of a district (pavet) presided according to his authority not only in the
ovincial districts (pavety) but in the central ones as well (except
districts of Vilnia and Troki) in cases of senator's absente.*

УДК 378(09)(476)

*М. М. Сакал*

# МАТЭРЫЯЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА СТУДЭНЦТВА БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ 20-Х ГГ. XX СТ.

Матэрыяльнае становішча студэнцтва, задавальненне
патрэбнасцяў заўсёды было важнейшым фактарам уплыву
працэс падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. Недас-
таткова толькі абвясціць магчымасць атрымання вышэйшай аду-
кацыі, неабходна стварыць сацыяльныя ўмовы для рэалізацы
гэтага права, матэрыяльна дапамагчы моладзі ў час навучання.
Невыпадкова і сёння студэнцтва застаецца адным з сацыяльна не
абароненых слаёў грамадства, мае патрэбу ў дапамозе з боку
дзяржавы. Дзяржава павінна авансаваць пэўныя матэрыяльныя

сродкі на падрыхтоўку будучага спецыяліста, без чаго немагчыма атрыманне адукацыі значнымі слаямі грамадства.

Праблема задавальнення сацыяльных патрэбнасцяў студэнцтва ў 20-я гг. XX ст. стаяла як ніколі востра. Прычынай таму былі аб'ектыўныя акалічнасці, якія да таго ж узмацняліся суб'ектыўнымі фактарамі.

Да аб'ектыўных акалічнасцяў трэба аднесці тое, што сама вышэйшая школа ў гэтыя гады перажывала перыяд станаўлення, калі ўсе матэрыяльныя праблемы арганізацыі вышэйшай адукацыі вырашаліся аднačасова, а фінансаванне сацыяльных патрэбнасцяў праходзіла, як правіла, па астаткавым прынцыпе. Да таго ж матэрыяльныя і фінансавыя магчымасці Савецкай Беларусі былі абмежаванымі, асабліва ў першай палове 20-х гг. Перад кіраўніцтвам рэспублікі ў гэты перыяд стаяла пытанне аб захаванні любымі сродкамі (у т. л. і шляхам скарачэння колькасці ВНУ і студэнтаў, увядзення аплаты за навучанне і інш.) вышэйшай адукацыі.

Вырашэнню гэтых складаных праблем не спрыяла сацыяльна-класавая палітыка, якая праводзілася кампартыяй у вышэйшай школе. Узяты курс на камплектаванне студэнцтва перш за ўсё за кошт выхадцаў з рабочага класа і сялянства патрабаваў даць маладым людзям з малазабяспечаных слаёў насельніцтва дзяржаўныя стыпендыі, месцы ў інтэрнатах, адзежу, арганізаваць харчаванне. Без гэтага моладзь не ў стане паспяхова вучыцца. Сведчаннем гэтага з'яўляецца вялікі працэнт студэнтаў, якія пакідалі вышэйшыя навучальныя ўстановы па ўласным жаданні, перш за ўсё па матэрыяльных прычынах. Выхадцы ж з забяспечаных слаёў насельніцтва, якія не так востра адчувалі патрэбу ў стыпендыях і маглі нават плаціць за навучанне, падвяргаліся пастаянным ганенням. Ад іх у першую чаргу настойліва пазбаўляліся шляхам усемагчымых чыстак, праверак сацыяльнага саставу, акадэмічнай паспяховасці і г. д. У выніку гэтай супярэчнасці — палітыкі кампартыі, накіраванай на камплектаванне студэнцтва перш за ўсё з малазабяспечаных слаёў ва ўмовах вострага недахопу матэрыяльных сродкаў для паспяховага навучання,— сацыяльныя праблемы студэнцтва вырашаліся павольна і з цяжкасцямі.

Фарміраванне структуры сацыяльнага забеспячэння студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў пачалося з першых дзён іх існавання. Ужо ў маі 1921 г. на сумеснай нарадзе Часовага прэзідыума Рабфака БДУ з прадстаўнікамі Саўпрафбела, ЦБ кампартыі і Саўнаргаса рэспублікі вырашаліся пытанні арганізацыі прыёму на рабфак, было прынята рашэнне «Об общежитии для слушателей Рабфака». Упраўленню справамі Белдзяржуніверсітэта было даручана «в ближайший срок подготовить общежитие на

60 человек, использовав для этой цели содействие ЦБ Партии и Совпрофбела» [1, л. 1 об.]. Для арганізацыі і рэгламентацыі жыцця ў інтэрнате ў тым жа годзе былі прыняты «Временные правила для пользующихся общежитием Белорусского государственного Университета» [2, л. 35]. У іх было запісана, што на інтэрнат маглі разлічваць студэнты, якія не мелі пастаяннага месца жыхарства ў г. Мінску. Рэгістрацыю маладых людзей і размеркаванне памяшканняў для пражывання праводзіў гаспадарчы персанал рабфака пры ўдзеле камісіі, выдзеленай ад студэнтаў факультэта. Былі вызначаны абавязкі пражываючых і парадак унутранага жыцця інтарната.

Аб тым, наколькі цяжкім у першыя гады існавання савецкай вышэйшай школы было матэрыяльнае становішча студэнцтва, якія крокі яно было вымушана пайсці дзеля таго, каб працягнуць навучанне, сведчыць знойдзены намі ў архіве дакумент, датаваны лістападам 1921 г. У ім дырэктар Беларускага дзяржаўнага політэхнічнага інстытута і сакратар па студэнцкіх справах паведамілі ў Асобы аддзел ЦБ КП(б)Б, што сярод студэнтаў інстытута было да 70 чалавек, якія паходзілі з мясцовасцяў, што знаходзіліся за дэмаркацыйнай лініяй. Матэрыяльнае становішча студэнтаў у інстытуце было вельмі цяжкім, бо яны не атрымоўвалі харчовыя пайкі і пытанне аб гэтым не вырашалася. «Естественно, что нужда в продуктах,— гаворыцца ў дакуменце,— заставляет этих лиц обращаться к родному дому за помощью, и бывают случаи, что некоторые из них под влиянием этих нужд принуждены переходить границу, чтобы дома запастись необходимыми продуктами. Ввиду могущих быть случаев задержания этих студентов при пересечении границы Политехнический институт убедительно просит в этих случаях представлять их в Институт для удостоверения личности и установления их характеристики, что отразится на несении ими учебно-трудовой повинности» [3, л. 5].

Пытанні фінансавання і матэрыяльнага становішча вышэйшых навучальных установ сталі прадметам абмеркавання на пасяджэнні вышэйшага дзяржаўнага органа — Савета Народных Камісараў ССР Беларусі пад старшынствам А. Р. Чарвякова (11 сакавіка 1922 г.). Было прынята рашэнне аб асігнаванні універсітэту 670 млн р. дзеля ліквідацыі запазычанасці за люты. Наркамасветы была зроблена заўвага, што ён мала ўдзяляе ўвагі сваім вышэйшым навучальным установам. Аб усёй сур'ёзнасці фінансавага становішча сведчыць пяты пункт пастановы: «Исходя из необходимости во что бы то ни стало сохранить и спасти высшие школы Белоруссии от гибели, которая им грозит, вследствие чрезвычайно ограниченных средств, отпускаемых государством на их содержание... обсудить и выяснить вопрос о размерах регу-

лярных, ежемесячных отчислений хозяйственных комиссариатов и организаций в пользу высшей школы... Намеченная разверстка должна быть немедленно проведена в жизнь, не дожидаясь окончательной санкции Совнаркома». Было таксама вырашана звярнуцца ад імя Саўнаркома да Гомельскага і Віцебскага павятовых выканкомаў (якія ўваходзілі на той момант у склад РСФСР) з просьбай аказання падтрымкі універсітэту і палітэхнікуму [4, л. 1].

Для забеспячэння хаця б мінімальных матэрыяльных патрэбнасцяў студэнцтва выкарыстоўваліся розныя каналы, формы і сродкі як з боку дзяржавы, так і грамадскіх арганізацый. Аднак варта адзначыць, што сацыяльная работа са студэнцтвам, як і ўся палітыка ў галіне вышэйшай адукацыі, насіла класавы характар. Стыпендыямі і месцамі ў інтэрнатах як найбольш значнымі матэрыяльнымі дабротамі ў першую чаргу забяспечваліся студэнты рабочых факультэтаў, камандзіраваныя на вучобу ў БДУ партыйнымі і камсамольскімі органамі, члены прафсаюзаў.

У 1922/23 навучальным годзе Беларускі дзяржаўны універсітэт меў інтэрнат для рабфакаўцаў на 100 месцаў, дзе пражывала 180 чалавек (з 370 навучэнцаў рабфака), сярод 2 453 студэнтаў асноўных факультэтаў інтэрнат мелі толькі 35 чалавек. К новаму навучальнаму году рамантаваліся яшчэ два будынкі пад інтэрнаты для студэнтаў рабфака на 80 месцаў і для студэнтаў астатніх факультэтаў на 25 месцаў. Ва універсітэце для абслугоўвання студэнтаў былі арганізаваны сталовая на 400 месцаў, цырульня, сапожна-рамонтная і кравецкая майстэрні. Дзяржаўнымі стыпендыямі былі забяспечаны ўсе студэнты рабфака і толькі 328 студэнтаў (13,4 %) астатніх факультэтаў. Прыватных стыпендый ва універсітэце не было. На выплату стыпендый студэнтам рабфака за перыяд з 1 кастрычніка 1922 г. па 1 кастрычніка 1923 г. было выкарыстана 461 420 р., на выплату стыпендый студэнтам іншых факультэтаў — 402 845 р. Памер стыпендый быў настолькі малым (8 р.), што стыпендыяты былі не ў стане плаціць за жыллё па стаўках камунальнай гаспадаркі. Таму прафсаюзнае выканкомбюро універсітэта ўзбудзіла хадайніцтва, каб дазволіць стыпендыятам не плаціць за камунальныя паслугі і даць ім у распараджэнне каля 5—10 % жылой плошчы Камунальнай гаспадаркі. Аб неабходнасці больш удзяляць увагі матэрыяльнаму становішчу студэнцтва гаварылі пры падвядзенні вынікаў 1922/23 навучальнага года ў жыцці БДУ народны камісар асветы У. М. Ігнатоўскі і рэктар У. І. Пічэта [5, л. 221—223, 268; 6, л. 6].

Не менш складанай была справа з забеспячэннем стыпендыямі ў Беларускім інстытуце сельскай гаспадаркі. Восенню 1923 г. у ім налічваўся 541 студэнт, аднак дзяржаўных стыпендый у інстытуце не было наогул, мелася толькі 16 стыпендый ад гаспадарчых органаў. Выканкомбюро студэнтаў і кіраўніцтва інстытута

ў кастрычніку 1923 г. звярнуліся ў СНК і ЦВК Беларусі з хадайніцтвам «войти в тяжелое материальное положение студенчества и назначить стипендии беднейшему студенчеству на текущий учебный год, оказать материальную помощь при организации студенческой столовой и прийти на помощь при организации общежития студентов». У адказе старшыні ЦВК БССР А. Р. Чарвякова ў гэтай просьбе фактычна было адказана: «...Правление института обязано из средств, предоставленных в его распоряжение, выделить ту небольшую сумму, которая потребна для выдачи стипендий и тем самым изжить создавшееся тяжелое положение». У снежні 1923 г. рэктар інстытута паведаміў у Прэзідыум ЦВК Беларусі аб тым, што інстытут знайшоў магчымасць устанавіць 75 стыпендый для тых студэнтаў, якія маюць у іх вялікую патрэбу. Але патрэбны былі яшчэ 100 стыпендый, аднак смета інстытута на навучальны год была складзена з дэфіцытам у 32 355 р. золатам, прычым у яе не ўвайшлі расходы на вучэбнае абсталяванне, арганізацыю інтэрната, сталовай і іншыя патрэбы [7, л. 7—8, 12; 8, л. 4].

Маючы даволі абмежаваныя фінансавыя магчымасці, ва ўмовах вельмі цяжкага таварнага крызісу ў пачатку 20-х гг. дзяржаўныя органы выкарысталі такую форму падтрымкі маламаёмных слаёў студэнцтва, як выдача харчовых пайкоў, колькасць якіх была даволі абмежаванай. Так, у красавіку—чэрвені 1923 г. Аддзелам абслугоўвання навучэнцаў Наркамата асветы РСФСР было цэнтралізавана выдзелена Мінскаму павятоваму прафсаюзу адукацыі Беларусі 350 пайкоў для БДУ, 90 пайкоў для Беларускага сельскагаспадарчага інстытута і 400 пайкоў для рабфака. Норма пайка складалася з 60 фунтаў мукі, 7,5 фунта крупы, 2,5 фунта масла, 15 фунтаў мяса і 20 фунтаў гародніны [9, л. 23].

Для аблягчэння матэрыяльнага становішча студэнтаў выкарыстоўвалася і такая форма, як ільготы. У маі 1923 г. пачалі дзейнічаць ільготныя тарыфы на праезд чыгуначным ці іншым відам транспарту, якім карысталіся студэнты ў перыяд зімніх, вясенніх і летніх канікулаў. Бясплатны праезд і правоз 2 пудоў багажу былі ўстаноўлены для студэнтаў-стыпендыятаў рабфакаў, а таксама для студэнтаў, камандзіраваных у ВНУ партыйнымі арганізацыямі. Ільготным тарыфам (скідкай у памеры 75 %) карысталіся ўсе студэнты-стыпендыяты. Для астатніх жа студэнтаў, якія не атрымоўвалі стыпендыю, скідка на праезд складала 50 % ад агульнага пасажырскага і багажнага тарыфу. У 1924 г. для ўсіх катэгорый студэнтаў пры карыстанні чыгуначным транспартам у час канікулаў і практыкі была ўстаноўлена адзіная льготная скідка ў памеры 50 % [10, л. 60, 78].

Дапамагчы студэнтам выжыць у складаных матэрыяльных умовах імкнуліся і грамадскія арганізацыі. Як састаўная частка

прафсаюзнага жыцця пачалі дзейнічаць Касы ўзаемадапамогі, якія атрымалі распаўсюджванне ва ўсіх вышэйшых навучальных установах. Ужо ў сакавіку 1923 г. быў прыняты Статут касы ўзаемадапамогі студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта [11, л. 50]. Стваралася яна са студэнтаў-стыпендыятаў, на агульным сходзе якіх праходзілі выбары Праўлення касы. Членамі гэтай арганізацыі не маглі быць студэнты, «живущие на нетрудовой доход своих родителей, родных или сами эксплуатирующие чужой труд, боровшиеся или борющиеся против Советской власти, опороченные по суду и т. д.». Каса мела сваёй мэтай садзейнічаць паляпшэнню эканамічнага становішча студэнтаў, якія мелі ў гэтым патрэбу. Былі вызначаны даволі разнастайныя формы яе дзейнасці: выдача пазык і дапамог маючым у гэтым патрэбу членам касы, арганізацыя і выдача пазык працоўным арцелям і калектывам, дзейнасць якіх накіравана на паляпшэнне быту студэнтаў; прадастаўленне маючым у гэтым патрэбу льгот пры карыстанні паслугамі студэнцкага кааператыва; дапамога ў працаўладкаванні студэнтаў. Сродкі касы складаліся з уступных і членскіх узносаў (адпаведна 10 к. і 5 к. золатам штомесяц), працэнтаў на капітал Касы, даходаў ад гаспадарчай дзейнасці, разнастайных ахвяраванняў, адлічэнняў ад зарплаты тых, хто карыстаўся паслугамі Бюро працы. Каса мела сваю пячатку і права юрыдычнай асобы.

Завяршэннем працэсу фарміравання сістэмы матэрыяльнага забеспячэння студэнтаў можна лічыць зацвярджэнне Калегіяй Наркамата асветы БССР у лістападзе 1923 г. «Положения о социальном обеспечении учащихся в учебных заведениях Профтехнического образования». У мэтах рацыянальнага размеркавання выдзяляемых дзяржавай, прафесійнымі і грамадскімі арганізацыямі сродкаў на сацыяльнае забеспячэнне навучэнцаў было вырашана стварыць Цэнтральную стыпендыяльную камісію з прадстаўнікоў Галоўнага прафсаюза адукацыі, Савпрафбела, ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМ, а таксама мясцовыя стыпендыяльныя камісіі ў вышэйшых навучальных установах. Было вызначана, што «социальное обеспечение выражается вообще в форме денежных выдач, но в зависимости от местных условий оно может натурализоваться (в виде устройства общежитий, столовых, выдачи одежды и проч.)» [12, л. 4—5]. Строга быў вытрыманы класавы прынцып размеркавання і аказання сацыяльнай дапамогі, якая вызначалася пры індывідуальнай праверцы кожнага студэнта і назначалася ў залежнасці ад яго: а) класавай прыналежнасці; б) ступені матэрыяльнай забяспечанасці. Зыходзячы з гэтых прыкмет, былі устаноўлены 3 катэгорыі сацыяльнага забеспячэння. Да першай катэгорыі адносіліся «материально вовсе не обеспеченные учащиеся», да другой — дзеці беспрацоўных членаў прафсаюзаў і дзеці

бяднейшых сялян, да трэцяй — дзеці членаў прафсаюзаў, меншых аклад менш чым 12 таварных рублёў. «Все остальные категории учащихся социальным обеспечением не пользуются», — было запісана ў палажэнні [тамсама].

На пасяджэнні Калегіі Наркамата асветы рэспублікі ў 1924 г. было зацверджана і Положение о стипендиальных комиссиях, якое вызначала іх функцыі, парадак фарміравання, прынцыпы размеркавання стыпендый. Такія камісіі ствараліся ў кожнай вышэйшай навучальнай установе. Пры Наркамаце асветы існавала Цэнтральная стыпендыяльная камісія [13, л. 18].

Забеспячэнне студэнцтва стыпендыямі было самай вострай складанай для вырашэння праблемай у 20-я гг. XX ст. Як памеры стыпендый, так і іх колькасць былі вельмі далёкімі ад рэальных патрэбнасцяў студэнцтва. Больш таго, у некаторыя гады з-за агульнаэканамічных цяжкасцяў у краіне адбывалася скарачэнне асігнаванняў на гэтыя патрэбы.

*КРЫНІЦЫ*


1. НАРБ, ф. 4-п, воп. 1, спр. 406.
2. НАРБ, ф. 205, воп. 1, спр. 5.
3. НАРБ, ф. 210, воп. 1, спр. 27.
4. НАРБ, ф. 210, воп. 1, спр. 28.
5. НАРБ, ф. 42, воп. 1, спр. 213.
6. НАРБ, ф. 205, воп. 1, спр. 66.
7. НАРБ, ф. 209, воп. 1, спр. 58.
8. НАРБ, ф. 209, воп. 1, спр. 74.
9. НАРБ, ф. 42, воп. 1, спр. 1192.
10. НАРБ, ф. 205, воп. 1, спр. 67.
11. НАРБ, ф. 205, воп. 1, спр. 33.
12. НАРБ, ф. 205, воп. 1, спр. 73.
13. НАРБ, ф. 4-п, воп. 7, спр. 19.


*SUMMARY*

*In his article the author describes the economic conditions of the undergraduate students of higher educational institutions of Belarus in the first part of 1920ies. The quantity and quantity changes in fulfilling of social demands of the students are traced on the basis of the archive documents, the main channels of receiving of the financial sources and search for the different ways of their replenishment are also examined here. The class essence of the state politics in the sphere of the economic supplying of the undergraduate students is critically appreciated.*